*А.У.Казлова (Рэспубліка Беларусь, Полацк,
УА “Полацкая дзяржаўная гімназія № 1
імя Ф. Скарыны”)*

# СЕТКАВЫ ВУЧНЁЎСКІ ПРАЕКТ ЯК СРОДАК ФАРМІРАВАННЯ МЕТАПРАДМЕТНАЙ КАМПЕТЭНТНАСЦІ Ў ПРАЦЭСЕ ФІЛАЛАГІЧНАЙ АДУКАЦЫІ (IX-XI КЛАСЫ)

*Сутнасць сеткавага праекта – раскрыццё вучэбнай тэмы праз слайды Google-прэзентацыі ў фармаце дыстанцыйнага ўзаемадзеяння і яго прадстаўленні афлайн. Сеткавы вучнёўскі праект з'яўляецца ўніверсальным сродкам фарміравання метапрадметнай кампетэнтнасці.*

***Ключавыя словы:*** *сеткавы праект; метапрадметная кампетэнтнасць; фарміраванне вучэбна-ўпраўленчай, універсальна-лагічнай, інфармацыйнай, даследчай, камунікатыўнай, тэхніка-тэхналагічнай кампетэнтнасці.*

*The sence of the network project is the discovery of the educational topic through slides of Google presentation in the format of remote interaction and its presentation online. A network student's project is a universal way to develop meta-subject competence.*

***Keywords:*** *network project; meta-subject competence; formation of educational and managerial, universally logical, information, research, communication, technology and technological competences.*

Адным з асноўных дакументаў, якімі павінен кіравацца настаўнік у сваёй дзейнасці, з'яўляецца Адукацыйны стандарт базавай і сярэдняй адукацыі, зацверджаны пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь 26.12.2018 № 125, у ім вялікая ўвага надаецца фарміраванню і развіццю метапрадметнай кампетэнтнасці. Метапрадметнасць – шматаспектнае паняцце; існуюць варыянты яе мадэлявання, што ўключаюць ў сябе некалькі складнікаў: вучэбна-ўпраўленчую, універсальна-лагічную, інфармацыйную, даследчую, камунікатыўную, тэхніка-тэхналагічную, тэарэтыка-анталагічную, інструментальна-эпістэмалагічную кампетэнтнасці [1, с. 7–12].

Настаўніку-прадметніку неабходна валодаць пэўнымі механізмамі, што рэалізуюць у адукацыйным працэсе кампетэнтнасны падыход. Адным з такіх дзейсных комплексных сродкаў з'яўляецца вучэбны сеткавы праект.

Сутнасць сеткавага праекта заключаецца ў раскрыцці вучнямі пэўнай вучэбнай тэмы праз слайды Google-прэзентацыі ў фармаце дыстанцыйнага ўзаемадзеяння і яго прадстаўленні афлайн (на вучэбных занятках).

Такога кшталту праекты варта прапаноўваць вучням 9–11 класаў, якія папярэдне атрымлівалі на ўроках заданні па стварэнні і прадстаўленні буклетаў, лэпбукаў, міні-праектаў, маюць вопыт па выкарыстанні і генерацыі QR-кодаў, запісе аўдыятрэкаў, стварэнні прэзентацыйных слайдаў.

Сеткавы праект па літаратуры можа быць прапанаваны вучням як па новай

тэме (*Беларуская літаратура. 11 клас. Сучасная беларуская літаратура. Рыгор Барадулін*), так і ў якасці абагульнення па пытаннях вучэбнага дапаможніка (*Беларуская літаратура. 9 клас. Якуб Колас. Паэма “Новая зямля”*).

Сумесна з вучнямі вызначаецца тэматыка слайдаў агульнага праекта, абмяркоўваюцца тэрміны падрыхтоўкі матэрыялаў і час яго прадстаўлення ў класе. На падбор матэрыялаў і стварэнне слайда для вучняў старшых класаў дастаткова 1-2 тыдні. Вучні выбіраюць падтэму агульнай тэмы праекта (можна вызначыцца з кірункам самастойна, можна прымяніць рандомны выбар праз выцягванне нумара пытання ў вучэбным дапаможніку). З вучнямі загадзя абмяркоўваюцца крытэрыі ацэнкі канчатковага выніку работы. Асноўныя правілы можна размясціць на другім пасля назвы слайдзе агульнай прэзентацыі. З абавязковых пунктаў – загаловак слайда, пазначэнне аўтарства, тэзіс з доказамі – радкамі з твора(ў) з указаннем іх назваў або канкрэтнага раздзела. Пажаданыя элементы – фота (без паўтораў), аўдыятрэк з уласным выразным чытаннем урыўка, QR-код, што ўказвае на выразнае чытанне верша(ў) або цікавую дадатковую інфармацыю па тэме з інтэрнэту.

Настаўнік да ўрока-абмеркавання вучэбнага сеткавага праекта рыхтуе на Google-дыску макет прэзентацыі з афармленнем першага слайда (назвы праекта), з указаннем крытэрыяў афармлення слайдаў і пэўнай колькасцю пустых, але пранумараваных слайдаў (кожны вучань афармляе свой слайд – нумар вучня ў класным журнале + 2). Важна не забыць адкрыць доступ да макета прэзентацыі ў рэжыме “Рэдактар” і даць спасылку вучням, каб яны маглі рэдагаваць дадзены праект.

Вучэбна-ўпраўленчая кампетэнтнасць вучняў фарміруецца праз разуменне вучнямі сутнасці задання (гэта можна ацаніць па ступені выканання пастаўленай задачы), праз матывацыйную гатоўнасць да выканання, праз уменне даць правільную ацэнку выніку (пры прадстаўленні канечнага прадукта можна прапаноўваць зрабіць самаацэнку дзейнасці або ацаніць работу іншага згодна з прад’яўленымі раней крытэрыямі). Першапачаткова важна звярнуць увагу вучняў на рацыянальнае размеркаванне часу пры выкананнні задання: для якаснага выніковага слайда неабходны не разавы зварот да тэмы напярэдадні прадстаўлення работы. Настаўнік у рэжыме рэальнага часу можа адсочваць, наколькі актыўна, правільна, якасна вядзецца самастойная работа кожным вучнем, кансультаваць індывідуальна, прытым як у фармаце афлайн, так і анлайн (пакідаючы каментары непасрэдна на слайдзе).

Універсальна-лагічная кампетэнтнасць удасканальваецца пры рабоце з інфармацыяй, калі вучні аналізуюць, параўноўваюць, абагульняюць інфармацыю, самастойна фармулююць вывады. Так, пра ўзровень сфарміраванасці вучэбных навыкаў можа сведчыць прад’яўленне інфармацыі на слайдзе: адзін вучань падае матэрыял у выглядзе табліцы з пацвярджэннем уласных тэзісаў цытатамі з тэксту, другі ж прапануе інфармацыю суцэльным тэкстам без пацвярджэння і ўказання крыніц.

Фармат аднаго слайда скіроўвае вучня на якаснае прадстаўленне інфармацыі: неабходна знайсці і адабраць неабходны матэрыял па тэме, сістэматызаваць яго,

удала прадставіць (пажадана ў запамінальным выглядзе – схемы, табліцы, воблака слоў, інш.).

Калі вучэбны дапаможнік не ўтрымлівае неабходнай інфармацыі, вучню трэба ўмела сфармуляваць інфармацыйны запыт, каб знайсці патрэбнае ў іншых крыніцах (напрыклад, якія цэны і заробкі былі напрыканцы XIX стагоддзя, каб зразумець, наколькі багатай ці беднай была сям’я Міхала з “Новай зямлі”). Такім чынам фарміруюцца даследчая і інфармацыйная кампетэнтнасці школьнікаў.

Падрыхтоўка ўласнага слайда (фармат “1 вучань – 1 слайд”) не прадугледжвае камунікацыю з аднакласнікамі, але і не выключае яе. Напрыклад, паважлівыя адносіны да “калег” па праекце заключаюцца ў акуратным стаўленні да работы іншага (не выдаліць ужо зроблены слайд аднакласніка, не “пажартаваць” няўдала, нарабіўшы памылак на чужым слайдзе). Калі ж ацэньваць фармат “1 слайд – 2 вучні”, то камунікатыўная кампетэнтнасць фарміруецца праз уменне ўступаць у дыялог, дамаўляцца, паважліва ставіцца да партнёра па працы, размяркоўваць абавязкі, пры прадстаўленні ўласных матэрыялаў – слухаць і чуць іншага.

Хоць настаўнікі і ўпэўнены ў тым, што сучасныя вучні абазнаныя ў тэхнічных прыладах, але праблемы са сфарміраванасцю тэхніка-тэхналагічнай кампетэнтнасці сустракаюцца. Заключаюцца яны ў няўменні працаваць з Google-прэзентацыяй разам (неабазнаныя вучні закрываюць доступ да прэзентацыі, лічачы, што закрываюць доступ да свайго слайда, робяць копію прэзентацыі, некарэтна размяшчаюць ілюстрацыі або тэкст). Вучні 11-х класаў больш ахвотна ўстаўлялі ўласныя аўдыятрэкі, запісаныя пры дапамозе сэрвісу vocaroo, выкарыстоўвалі QR-коды, бо часцей сустракаліся з падобнымі заданнямі. Улічваючы гэта, і настаўнік беларускай мовы і літаратуры можа працаваць над падвышэннем дадзенай кампетэнтнасці.

З вышэй згаданымі вучнёўскімі праектамі і прэзентацыяй-абагульненнем можна пазнаёміцца па наступнай спасылцы: https://drive.google.com/drive/folders/1Pqb0ULJCiJ9PAvBYpwZvzLAB8o2nEa8U?usp=sharing.

Работа вучняў над сеткавым праектам скіравана на рознабаковае развіццё асобы вучня, на ўдасканаленне ўжо набытых навыкаў, на фарміраванне метапрадметнай кампетэнтнасці. Настаўнік, які прапануе вучням такога кшталту работу, павінен усведамляць, што збольшага праект выступае ў ролі развіццёвага задання. Для таго каб прасачыць павышэнне ўзроўню сфарміраванасці канкрэтнай вышэй названай кампетэнтнасці, неабходна перыядычна прапаноўваць вучням такую работу. Калі гэтая дзейнасць будзе праводзіцца ў сістэме, то, бясспрэчна, вучні будуць больш падрыхтаванымі для выканання розных задач у дарослым жыцці.

### *Літаратура*

1. Гелясина, Е.В. Метапредметная компетентность: сущность, содержание, критерии сформированности/ Е.В. Гелясина// Народная асвета. – 2019. – № 1. – С. 7 – 12.